*УДК 37.017:398.8(=161.3)*
***А. А. Кастрыца, В. С. Новак***
*г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны*

# ВЫХАВАЎЧЫ ПАТЭНЦЫЯЛ БЕЛАРУСКІХ НАРОДНЫХ ПЕСЕНЬ

У складзе фальклорнай спадчыны любога народа асаблівае месца займаюць песні, вытокі якіх узыходзяць да глыбокай старажытнасці. "Песенная паэзія на працягу многіх стагоддзяў была плёнам вуснамоўнай творчасці народа, і менавіта гэтая адзіная форма шматвяковага існавання народнай песні разам з мелодыяй, якую даў ёй народны творца, стварыла тую непаўторную яе своеасаблівасць, якая не перастае здзіўляць, уражваць, хваляваць, захапляць" [1, с. 8].

Выхаваўчы патэнцыял фальклорных песень раскрываецца ў некалькіх кірунках: гэта эфектыўны спосаб трансляцыі этнакультурных каштоўнасцей, інструмент фарміравання асобы і дапамогі ў сацыяльнай адаптацыі маладых людзей.

Далучэнне моладзі да народнай паэзіі можа здзяйсняцца як на ўроках літаратуры ў школе, лекцыйных і практычных занятках па фальклоры і міфалогіі ва ўніверсітэце, так і на класных і куратарскіх гадзінах, а таксама падчас школьных і ўніверсітэцкіх мерапрыемстваў, у працэсе падрыхтоўкі і ўдзелу ў тэматычных конкурсах.

Традыцыйныя народныя песні могуць быць выкарыстаны ў выхаваўчым працэсе ў розных фарматах. Адзначым, што незалежна ад мэты мерапрыемства варта рабіць акцэнт на інтэрактыўнасць, "пагружэнне" ў традыцыю і творчую рэалізацыю ўдзельнікаў.

У школе можна наладзіць серыю тэматычных майстар-класаў з абавязковым выніковым канцэртам. Праходзіць гэтыя майстар-класы будуць на пастаяннай аснове адзін раз на месяц з запрашэннем бацькоў, бабуль і дзядуль, што вельмі важна з нагоды пераемнасці традыцый і захавання традыцыйных сямейных каштоўнасцей. Вучні будуць знаёміцца з гадавым цыклам народных святаў праз слуханне і выкананне абрадавых песень, выраб абрадавых масак і некаторых элементаў абрадавага адзення, знаёмства і спажыванне рытуальнай выпечкі, загадзя падрыхтаванай дома разам з бацькамі, гулянне ў народныя гульні. Па матывах таго, што адбываеца на майстар-класах можна, здымаць міні-відэарэпартажы, якія неабходна выкладваць ў лентах сацыяльных сетак і на сайтах устаноў адукацыі з мэтай далучэння да працэсу, няхай нават у якасці гледачоў, як мага большай колькасці людзей.

Ва ўніверсітэце можна 1) праводзіць тэматычныя круглыя сталы, на якія, акрамя фальклarыстаў, у якасці спікераў запрашаць псіхолагаў, метадыстаў выхаваўчых устаноў, кіраўнікоў кружкоў; 2) рэканструяваць абрады з абавязковым выкананнем песень; 3) наладжваць сіламі маладых людзей канцэрты, на якія запрашаць прадстаўнікоў старэйшага пакалення, ветэранаў працы; 4) наладжваць традыцыйныя фальклорныя святы, фіксаваць іх на відэа з паступовым складаннем відэакартатэкі беларускіх народных традыцый; 5) запісваць падкасты з майстрамі і аматарамі народных спеваў.

Сярод цікавых мерапрыемстваў з апорай на песенны фальклорны тэкст можна адзначыць "Геаграфічны фальклорны квест" (каманды атрымліваюць "маршруты" па раёнах Гомельшчыны ў прыватнасці і Беларусі ўвогуле і шукаюць адказы праз песні); "Музычная скарбонка" (пошук народных песень у тэкстах твораў мастацкай літаратуры з паступовым іх аналізам); "Ад мінулага да будучага праз сучаснасць" (запіс народных песень у сучаснай апрацоўцы з іх афішыраваннем праз усе фарматы інтэрнэт-пляцовак), "Караоке па-народнаму" (выкананне фальклорных песень); "Майстэрня аўтара" (скласці ўласны тэкст у фальклорнай манеры з выкарыстаннем штучнага інтэлекту для стварэння музыкі); "Перапрашыўка" (песню аднаго жанру выканаць у манеры другога), "Стары скарб – новы куфар" (конкурс на лепшае выкананне, арыгінальную аранжыроўку або сцэнічнае рашэнне, каб узнавіць атмасферу эпохі і інш.).

Для арганізацыі ўсіх адзначаных вышэй мерапрыемстваў важна ўлічваць некаторыя прынцыпы: аўтэнтычнасць (прыцягненне носьбітаў традыцыі, апора на рэгіянальныя асаблівасці песеннага фальклору), інтэрактыўнасць (мінімум статычнасці і максімум актыўнасці), міждысцыплінарнасць (сувязь з гісторыяй, этнаграфіяй, псіхалогіяй); тэхналагічнасць (выкарыстанне аўдыёархіваў, сацяльных сетак, сайтаў устаноў адукацыі для папулярызацыі). Нельга абмяжоўвацца простым развучваннем мелодыі і тэксту, варта расказваць гісторыю песні, яе сувязь з народным календаром і побытам; тлумачыць значэнне састарэлых слоў і вобразаў, каб сучаснае дзіця разумела сэнс, выкарыстоўваць візуальныя матэрыялы (фатаграфіі, малюнкі, прадметы побыту і да т. п.), каб узнавіць атмасферу эпохі.

Як адзначалася вышэй, абрадавыя песні вельмі важныя ў выхаваўчым працэсе. Яны спрыяюць фарміраванню нацыянальнай ідэнтычнасці праз усведамленне прыналежнасці да свайго народа і культуры, засвойванне этнакультурных кодаў праз мову, вобразы, інтанацыі, развіццё пачуццё гонару за традыцыі продкаў; дапамагаюць маральна-этычнаму выхаванню праз адлюстраваныя ў тэкстах базавыя каштоўнасці (павага да старэйшых, захаванне сямейных каштоўнасцей, працалюбства, гасціннасць, ашчадныя адносіны да свету прыроды, узаемадапамога, засваенне паводзінных нормаў і да г. п., напрыклад: "*Святы вечар, за етым словам жывіце з Богам, // Святы вечар, самі з сабою, з дзецьмі, з жаною*" (запісана ў в. Малыя Аўцюкі Калінкавіцкага р-на ад Буцэнка Марыі Іванаўныі, 1936 г.н.); "*Тройца, Тройца, святая Багародзіца, // Пасею лёна, няхай зародзіцца. // Што харошы лён, то для матанькі маёй, // А што найхарошшы, для мяне, маладой*" (запісана ў в. Юравічы Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобл. ад Раманавай Евы Пятроўны, 1931 г.н.); "*Ой, выйдзем, дзевачкі, // На новае лета. // Зімавалі – не спевалі, вясну ждалі... // Ой, чырочко-пташэчко, // Не залетай далечэчко, // Не занось венчыка, // Бо мой венчык-патрэбчык. // Братка жаніці, // Сястру замуж аддаці. // Сястру замуж аддаці, // Вяселле спраўляці*" (запісана ў в. Макарычы Петрыкаўскага р-на ад Вяргей Фядоссі Касьянаўны, 1913 г.н.); садзейнічаюць эмацыянальнаму, сацыяльна-камунікатыўнаму, пазнаваўчаму развіццю (эмпатыя, узаемадзеянне, навыкі супрацоўніцтва і адказнасці, пашырэнне кругагляду праз фальклорныя сюжэты) і эстэтычнаму выхаванню (музычны слых і мастацкі густ).

Такім чынам, уключэнне абрадавых песень у сучасны выхаваўчы працэс – гэта не столькі даніна мінуламу, колькі стратэгічны крок да выхавання маладога пакалення, якое ўсведамляе сваю культурную ідэнтычнасць; шануе спадчыну продкаў; здольна творча пераасэнсоўваць традыцыі ў сучасным кантэксце; валодае ўстойлівымі маральнымі арыенцірамі. Захаванне і актуалізацыя абрадавага песеннага фальклору дапамагае выбудаваць мост паміж гісторыяй і сучаснасцю, робячы культуру жывой і запатрабаванай.

*Выкарыстаны матэрыялы навукова-вучэбнай фальклорнай лабараторыі пры кафедры рускай і сусветнай літаратуры ўстановы адукацыі "Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны".*

**Літаратура**

1. Пазаабрадавая паэзія / А. І. Гурскі, Г. А. Пятроўская, Л. М. Салавей; Навук. рэд. А. С. Фядосік. – Мн. : Бел. навука, 2002. – 564 с.